УДК 930(474.5+438)

# РАССМОТРЕНИЕ ВЗАИМООТНОШЕНИЙ ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО С КОРОЛЕВСТВОМ ПОЛЬСКИМ В КОНЦЕ XIV – СЕРЕДИНЕ XVIВВ. В ПОЛЬСКОЙ ИСТОРИОГРАФИИ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XX – НАЧАЛА XXIВВ.

# РАЗГЛЯД СТАСУНКАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА З КАРАЛЕЎСТВАМ ПОЛЬСКІМ У КАНЦЫ XIV – СЯРЭДЗІНЕ XVI СТСТ. У ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX – ПАЧАТКУ XXI СТСТ.

# CONSIDERATION OF THE RELATIONS OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA WITH THE KINGDOM OF POLAND IN THE END OF THE XIV – THE MID OF THE XVI CENTURY IN POLISH HISTORIOGRAPHY OF THE SECOND HALF OF THE XX – THE BEGINNING OF THE XXI CENTURY

Л.В. Николаева/L. Mikalayeva

Учреждение образования «Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники»/

BelarusianStateUniversityofInformaticsandRadioelectronics

В статье дана краткая характеристика деятельности важнейших представителей польских историографических школ, занимавшихся изучением взаимоотношений между Великим Княжеством Литовским и Королевством Польским в конце XIV – серединеXVI вв. с послевоенного периода до начала XXI в. Делается вывод о том, что в рассматриваемый период польскими историками был сделан значительный вклад в исследование данной темы и заложен фундамент для дальнейших научных изысканий.

У артыкуле даецца кароткая характарыстыка дзейнасці важнейшых прадстаўнікоў польскіх гістарыяграфічных школ, якія займаліся вывучэннем узаемаадносін паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Каралеўствам Польскім у канцы XIV – сярэдзіны XVI стст. з пасляваеннага перыяду да пачатку XXI ст. Робіцца выснова аб тым, што ў разглядаемы перыяд польскімі гісторыкамі быў

зроблены значны уклад у даследаванне дадзенай тэмы і закладзены падмурак для далейшых навуковых пошукаў.

The article provides a brief characteristic of the activities of the most important representatives of the Polish historiographic schools who studied the relationship between the Grand Duchy of Lithuania and the Kingdom of Poland in the end of the XIV – the mid of the XVI centuryfrom the post-war period to the beginning of the XXI century.It is concluded that during the period under review, Polish historians made a significant contribution to the study of this topic and laid the foundation for further scientific research.

Ключевые слова: историография; внешняя политика; Великое Княжество Литовское, Королевство Польское.

Ключавыя словы: гістарыяграфія; знешняя палітыка; Вялікае Княства Літоўскае, Каралеўства Польскае.

Keywords: historiography; foreign policy; the Grand Duchy of Lithuania, the Kingdom of Poland.

Тэма стасункаў паміж Вялікім Княствам Літоўскім (далей – ВКЛ) і Каралеўствам Польскім адносіцца да ліку ключавых у польскай гістарыяграфіі другой паловы XX – пачатку XXI стст. З улікам немагчымасці даць поўны аналіз разгляду ўсіх апектаў літвінска-польскіх кантактаў, закранаўшыхся ў працах польскіх даследчыкаў, з-за абмежаванага аб’ёму публікацыі паспрабуем коратка ахарактарызаваць творчасць польскіх гісторыкаў, якія займаліся праблемамі літвінска-польскіх узаемаадносін перыяду канца XIV – сярэдзіны XVI стст. з пасляваеннага часу да пачатку XXI ст.

Актывізацыя ў канцы XIX ст. – 30-х гг. XX ст. польскімі навукоўцамі даследаванняў па праблемах літвінска-польскіх дачыненняўзаклала добрую базу для іх працягу на наступным этапе вывучэння. Аднак падзеі Другой сусветнай вайны ўнеслі свае карэктывы.

У пасляваенны перыяд выжыўшым і застаўшымся ў краіне польскім даследчыкам даводзілася працаваць у новых умовах, часта змяніўшы тэмы сваіх навуковых зацікаўленняў на больш актуальныя і прымальныя для новай

улады. Асаблівасці пасляваеннага міжнароднага становішча Польскай Народнай Рэспублікі і характар адносін з СССР наклалі адбітак на праблематыку даследаванняў польскіх гісторыкаў.У канцы 1940-х гг. працы па гісторыі ВКЛ яшчэ выходзілі, як, напрыклад, даследаванне«SpołeczeństwolitewskiewXVwieku» Вітальда Камянецкага (1883 – 1964) [1], у якім быліабагулены вынікі папярэдніх напрацовак аўтара і прадстаўлены некаторыя спрэчныя погляды. Так, напрыклад, В. Камянецкі меркаваў, што ў XVст. улада вялікіх князёў літоўскіх на этнічна літоўскіх землях мела дэспатычны, нікім неабмежаваны характар. На іншых тэрыторыях ВКЛ яе аб’ём некалькі памяншаўся пад уздзеяннем мясцовых прававых практык і звычаяў, аднак у цэлым па краіне яна, на думку даследчыка, заставалася дастаткова моцнай.Аўтар адзначаў таксама ўзмацненне з часоў кіравання Казіміра Ягелончыка ролі Рады паноў ВКЛ і вызначэнне яе шырокіх кампетэнцый ў агульназемскім прывілеі 1492 г. Але, прызнаючы названыя акалічнасці, В. Камянецкі на адмаўляўся ад прызнання наяўнасці ў манархаў ВКЛ фактычнай усемагутнасці, абмежаванне якой ён лічыў нязначным[1, s. 21, 27, 30, 40 iin.].

Між тым, ужо ў пачатку 1950-х гг. зварот польскіх даследчыкаў да старонак палітычнай гісторыі ВКЛ стаў негатыўна ўспрымацца ўладамі. Узаемаадносіны Ягелонаў з Маскоўскай дзяржавай заставаліся ў гэты час па-за рамкамі праблематыкі гістарычных прац.Падвергся крытыцы і тэзіс аб гістарычнай «місіі» Польшчы на Усходзе. Сітуацыя змянілася толькі ў другой палове 1950-х – 1960-х гг., калі гісторыя літвінска-польскіх узаемаадносін зноў трапіла ў лік прадметаў даследавання польскіх вучоных.

Адзін з буйнейшых цэнтраў вывучэння гісторыі ВКЛ быў створаны ў Познані, куды пасля Другой сусветнай вайны пераехаў з Вільні Хенрык Лаўмяньскі (1898 – 1984). У яго пасляваенных працах прысутнічаў як заахвочваемы ўладамі эканамічны аспект, так і іншыя пытанні гісторыі ВКЛ. Да іх ён звяртаўся, аднак, амаль заўсёды толькі ў выпадку прац больш шырокага плана – аб пачатковых этапах гісторыі славянскіх і балтыйскіх

дзяржаў, культурных баках жыцця іх грамадства. У гэтай сувязі можна адзначыць зборнік прац Х. Лаўмяньскага «StudianaddziejamiWielkiegoKsięstwaLitewskiego», у які ўвайшлі даследаванні, створаныя ў розны час (1931 – 1972 гг.)[2]. Важную ролю у развіцці польскай гістарыяграфіі адыграў уключаны ў зборнік артыкул «Uwagiwsprawiepodłożaspołecznegouniijagiellońskiej», у якім былі разгледжаны сацыяльныя і эканамічныя перадумовы літвінска-польскай уніі [2, s. 365-454]. Дадзены артыкул садзейнічаў пераадольванню ідэалізацыі значэння ўніі ў развіцці ВКЛ, характэрнай для папярэдняй польскай гістарыяграфіі. Х. Лаўмяньскі выявіў, што галоўнай прычынай заключэння Крэўскай уніі 1385 г. былі цяжкасці, якія ВКЛ перажывала ў другой палове XIVст., пасля няўдалых спроб узяць пад свой кантроль паўночна-ўсходнія рускія замлі, а таксама небяспека з боку Тэўтонскага ордэна. Таксама аўтар выявіў ролю баярства ў заключэнні Крэўскай уніі і прыняцці хрысціянства Літвой. Х. Лаўмяньскі адзначаў, што нягледзячы на моцную ўладу вялікага князя, вярхі грамадства ў асобе Рады паноў ВКЛ выразна ўплывалі на рашэнні манарха. Аднак заканадаўча гэты ўплыў быў зафіксаваны толькі ў 1492 г. [2, s. 371, 381, 385-388]. Даследчык лічыў, што баярства менавіта літоўскага паходжання іграла ў ВКЛ вядучую ролю, і мала ўвагі надаваў баярству ўсходнеславянскага паходжання.Ён лічыў, што захопленыя літоўскімі князямі рускія землі былі пазбаўленыя «моцнага пласта ваеннаслужылых людзей»[2, s. 393], што «рухомы і ваяўнічы літоўскі элемент уліваў у рускае грамадства свежыя сілы» [2, s. 400]. Такім чынам, Х. Лаўмяньскі быў схільны перавялічваць ролю літоўскай эміграцыі на землях Беларусі і Украіны, уплыў Літвы на іх развіццё, недаацэньваў актыўнасць і палітычную ролю мясцовага баярства.

Шэраг прац заснавальніка познаньскай гістарыяграфічнай школы, надзвычай важных для вывучэння літвінска-польскіх адносін, былі падрыхтаваны да выдання яго паслядоўнікамі толькі пасля гібелі Х. Лаўмяньскага ў пад коламі трамвая ў 1984 г.Адна з прац, «ZaludnieniepaństwaLitewskiegowwiekuXVI. Zaludnieniewroku 1528»[3],

утрымлівае аналіз попісаў войска ВКЛ у 1528, 1565 і 1567 гг. як крыніц па гісторыі насельніцтва ВКЛ. Яна адзначае прабелы ў гэтых дакументах, падкрэслівае іх адрозненні, прасочвае рост колькасці насельніцтва ў 1528 – 1567 гг. Тым самым даецца характарыстыка ваенна-дэмаграфічна патэнцыялу ВКЛ на выпадак вядзення ваенных дзеянняў, вель важнага для ацэнак паспяховасці знешнепалітычных акцый.Яшчэ адна праца, «PolitykaJagiellonów»[4], верагодна, была створана Х. Лаўмяньскім яшчэ ў 1940-я гг. і пазней так і не была дапрацавана аўтарам з улікам новых канкрэтна-гістарычных даследаванняў. У яе структурную аснову быў пакладзены не храналагічны, а праблемны прынцып выкладання матэрыяла. Гісторык паставіў перад сабой задачу ўпісаць палітыку Ягелонаў у шырокі кантэкст еўрапейскай гісторыі. Спецыяльна прыпыніўшыся на сітуацыі 1386 г., ён адзначае яе пераломнае значэнне для польскай гісторыі. Х. Лаўмяньскі надаў асаблівую увагу знешнепалітычнай праблематыцы, якая займае большую частку кнігі. Кожны напрамак знешняй палітыкі, кожная значная ваенная падзея была адзначана аўтарам. А прасочанне ўзаемасувязі паміж унутранай і знешняй палітыкай надало аналізу падзей дадатковую вартасць. Відавочным недахопам працы з’яўляецца невыкарыстанне аўтарам напрацовак расійскай гістарыяграфіі па праблемах унутрыпалітычнай гісторыі ВКЛ, без уліку якіх аналіз стану вывучэння гісторыі літвінска-польскай уніі з’яўляецца няпоўным. У цэлым яна не адлюстроўвае актуальны стан навуковых гістарычных ведаў па праблеме.

Сярод прац, створаных у першае пасляеваеннае дзесяцігоддзе, вартыя ўвагі даследаванні працаваўшага ў Познані Зыгмунта Вайцяхоўскага (1900 – 1955)«Państwopolskiewwiekach średnich. Dziejeustroju»[5], «ZygmuntStary (1506–1548)» [6] і прадстаўніка кракаўскай школы Уладзіслава Пацехі (1893 – 1958)«CzasyZygmuntaStarego»[7], «KrólowaBona (1494–1557): czasyiludzieOdrodzenia» [8]. У лікугэтых прац асабліва вылучалася шматтомная фундаментальная манаграфія У. Пацехі, прысвечаная каралеве Боне, выданне

якой спачатку было прыпынена камуністычнамі ўладамі і аднавілася толькі ў 1958 г.

Значны асяродак даследаванняў літвінска-польскіх дачыненняў склаўся ў Варшаве, дзе працавалі аўтар шматлікіх прац па гісторыі ВКЛ Юліуш Бардах (1914 – 2010) [9; 10; 11; 12; 13; 14; 15; 16; 17; 18; 19] і Анна Сухені-Грабовска (1920 – 2012) [20; 21; 22; 23]. У Варшаве, Беластоку і Катовіцах працаваў Анджэй Вычаньскі (1924 – 2008), які аддаў даніну павагі гісторыі ўзаемаадносін ВКЛ і Польшчы ў XVI ст., а таксама разгледзеў дыпламатычны і ваенныя аспекты знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ ў часы кіравання Жыгімонта Старога [24; 25; 26]. У працы «PolskawEuropieXVIstulecia», характарызуючы адносіны ВКЛ і Польшчы сярэдзіны XVIст., А. Вычаньскі адзначыў уніфікацыйны характар тагачасных рэформ у ВКЛ, а таксама актыўны, рацыянальны і прагматычны характар знешняй палітыкі Каралеўства Польскага [24].

Высокіўзровень распрацаванасці праблем міжнародных адносін у польскай гістарыяграфіі дазволіў падрыхтаваць шэраг фундаментальных калектыўных прац па гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі Польшчы. Так, у1982 г. падрэдакцыяй МарцінаБіскупавыйшаўпершытом«Historii dypłomacjiPolskiej» [27], дзеўтрамліваласяіінфармацыя, штодатычала і знешняйпалітыкіВКЛ. У даследаванні быў праведзены кампаратыўны аналіз дыпламатычных служб ВКЛ і Каралеўства Польскага, вызначаны крытэрыі іх адрозненняў, якія, на думку аўтараў, былі абумоўлены гістарычнымі асаблівасцямі развіцця дзвюх краін.

Слынным прадстаўніком познаньскай гістарыяграфічнай школы быў вучань Х. Лаўмяньскага Ежы Ахманьскі (1933 – 1996), аўтар знакавай сінтэтычнай працы па гісторыі Літвы ад старажытнасці да савецкага часу, упершыню апублікаванай у 1967 г. [28]. У ёй знайшлі адлюстраванне новыя падыходы і погляды на пытанні гісторыі ВКЛ, яго міжнароднае становішча і ўзаемаадносіны з Каралеўствам Польскім і іншымі суседзямі. Аўтар адзначаў, што войны ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім з канца XV ст. прымусілі ВКЛ

шукаць зближэнне з Польшчай. Аднак у праўленне Жыгімонта Старога (1506 – 1548) і Жыгімонта Аўгуста (1548 – 1572), нягледзячы на персанальную ўнію, ВКЛ заставалася суверэннай дзяржавай. Даследаванне Е. Ахманьскага атрымала вельмі добрыя рэцэнзіі літоўскай дыяспары за мяжой, некалькі разоў перавыдавалася.

З познаньскага навуковага цэнтра паходзіў Марцэлі Косман, аўтар шэрагу прац па гісторыі ВКЛ і літвінска-польскіх стасункаў [29; 30; 31; 32; 33]. Апошнія яго выданні маюць абагульняючы характар.

Вучань Е. Ахманьскага Гжэгаж Блашчык таксама адзначыўся класічнай, вартай увагі сінтэтычнай працай па гісторыі ВКЛ мяжы позняга Сярэднявечча – пачатку Новага часу«Litwanaprzełome średniowieczainowozytności: 1492–1569», значная частка якой была прысвечана пытанням знешняй палітыкі і дыпламатыі ВКЛ [34]. Галоўным яго праектам стала манаграфія«Dziejestosunkówpolsko-litewskich», прысвечаная ўсяму комплексу літвінска-польскіх узаемаадносін перыяду Сярэднявечча і Новага часу. Першы том працы, прысвечаны этапу да Крэўскай уніі 1385 г., выйшаў у 1998 г. і быў прыхільна сустрэты крытыкай [35]. У 2007 г. пабачыла свет першая частка другога тома даследавання, храналагічна ахапіўшая 1385 – 1492 гг. [36]. Вызначальны ўжо яе аб’ём, які перавысіў 900 старонак тэксту, насычанага датамі, падзеямі, дробнымі, але істотнымі момантамі, што датычылі не толькі літвінска-польскіх стасункаў, але і іншых бакоў гісторыі ВКЛ.

Не застаўся ў баку ад праблемы літвінска-польскіх кантактаў і другі вучань Е. Ахманьскага Кшыштаф Пяткевіч. Яго манаграфія«WielkieKsięstwoLitewskiepodrządamiAleksandraJagiellonczyka. StudianaddziejamipaństwaispołeczeństwanaprzełomieXViXVIwieku», прысвечаная гісторыі ВКЛ перыяду кіравання Аляксандра Ягелончыка, карыстаецца слушнай павагай сярод даследчыкаў-літуаністаў [37]. Цікавыя погляды аўтара прадстаўлены ў ёй і на знешнюю палітыку ВКЛ, праблемы яе ажыццяўлення і кіравання.

Прадстаўніком малодшага пакалення познаньскай школы з’яўляецца Яраслаў Нікодэм, аўтар шэрагу артыкулаў і манаграфій па праблемах літвінска-польскіх адносін перыяду Сярэднявечча [38; 39; 40; 41; 42; 43; 44].

Традыцыі кракаўскай гісторыка-юрыдычнай школы ў даследаванні літвінска-польскіх дачыненняў працягнуў Вацлаў Урушчак [45; 46; 47; 48]. Таксама ў гэтым рэчышчы працуе кракаўская даследчыца Лідзія Корчак, у вобласць навуковых зацікаўленняў якой побач з пытаннямі структуры ўлады ВКЛ, кшталтавання эліты і пачаткаў парламентарызму ўваходзяць і праблемы грамадска-палітычных падстаў польска-літвінскай уніі і дыпламатычныя стасункі Каралеўства Польскага і ВКЛ, асабліва ў другой палове XV ст. [49; 50; 51].

У наш час шырокім спектрам праблем з галіны літвінска-польскіх дачыненняў XV – сярэдзіны XVI стст. займаецца працуючы ў Варшаве Дамінк Шульц [52; 53]. Пытанні літвінска-польскіх адносін сярэдзіны XVI ст. закранаюцца таксама ў працах варшаўскіх гісторыкаў Анджэя Рахубы [54; 55; 56], Анджэя Закшэўскага [57; 58; 59], Хенрыка Люлевіча (1950 – 2019) [60], Хенрыка Віснера [61].

Такім чынам, у разглядаемы перыяд польскімі даследчыкамі была напісана вялікая колькасць як вузкаспецыялізаваных, так і сінтэтычных даследаванняў, прысвечаных літвінска-польскім дачыненням, назапашаны шэраг канцэптуальных падыходаў. Тым самым быў зроблены значны ўнёсак у даследаванне польска-літвінскіх адносін, створаны грунтоўны падмурак для творчасці далейшых пакаленняў гісторыкаў.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Kamieniecki, W. Społeczeństwo litewskie w XV wieku/ W. Kamieniecki. – Warszawa: Nakładem Towarzystwa Naukowego Warszawskiego, 1947. – 125, III s.

2. Łowmiański, H. Studia nad dziejami Wielkiego Księstwa Litewskiego / H. Łowmiański. – Poznań : Wydawnictwo Naukowe UAM, 1983. – 579 s.

3. Łowmiański, H. Zaludnienie państwa Litewskiego w wieku XVI. Zaludnienie w roku 1528 / H. Łowmiański; do druku przygotowali A. Kijas i K. Pietkiewicz. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 1998. – 227 s.

4. Łowmiański, H. Polityka Jagiellonów / H. Łowmiański; do druku przyg. K. Pietkiewicz. – Poznań:Wydawnictwo Poznańskie, 1999. – 673 s.

5. Wojciechowski, Z. Państwo polskie w wiekach średnich. Dzieje ustroju/ Z. Wojciechowski. – Wyd. 1. – Poznań: Księgarnia Akademicka, 1945. – 276 s.; Wyd. 2. – Poznań: Księgarnia Akademicka, 1948. – 405 s.

6. Wojciechowski, Z. Zygmunt Stary (1506–1548)/ Z. Wojciechowski. – Wyd. 1. – Warszawa: S. Arct, 1946. – 394 s.; Wyd. 2. – Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy, 1979. – 434 s.

7. Pociecha, W. Czasy Zygmunta Starego/ W.Pociecha// Roczniki Historyczne. – 1947. – R. XVI. – S. 184 – 230.

8. Pociecha, W. Królowa Bona (1494–1557): czasy i ludzie Odrodzenia / W. Pociecha. – Poznań:Nakładem Poznańskiego Towarzystwa Przyjaciół Nauk, 1949 – 1958. – T. 1. – 1949. – 324 s.; T. 2. – 1949. – 598 s.; T. 3. – 1958. – 264 s.; T. 4. – 1958. – 548 s.

9. Bardach, J. Historia państwa i prawa Polski/ J.Bardach,B. Leśnodorski,M. Pietrzak. – Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1976. – 654 s.

10. Bardach, J. Krewo i Lublin. Z probliemów Unii polsko-litewskiej / J. Bardach // Bardach J. Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV – XVI wieku. – Warszawa: PWN, 1970. – S. 11–67.

11. Bardach, J. Litewskość w państwowości i systemie prawa Wielkiego Księstwa w XVI-XVIII stuleciach / J. Bardach // Tarp istorijos ir butovės: studijos prof. Edvardo Gudavičiaus 70-mečiui, pod red. A. Bumblauskasa, R. Petrauskasa. – Vilnius: Aidai, 1999. – 517 s. – S. 349–366.

12. Bardach, J. O dawniej i niedawniej Litwie/ J. Bardach. – Poznań: Wydawnictwo Naukowe UAM, 1988. – 443 s.

13. Bardach, J. O związku Polski z Litwą – kontrowersyjnie/ J. Bardach // Kwartalnik Historyczny. – 1981. – T. 88. – Z. 4. – S. 1061–1066.

14. Bardach, J. Od aktu w Krewie do Zaręczenia Wzajemnego Obojga Narodów (1385–1791)/ J. Bardach // Unia Lubelska i tradycje integracyjne w Europie Środkowo-Wschodniej, pod red. J. Kłoczowskiego, P. Krasa, H. Łaszkiewicza, B. Koshela, A.L. Sowy. – Lublin: Instytut Europy Środkowo-Wschodniej, 1999. – 224 s. – S. 12–44.

15. Bardach, J. Statuty Wielkiego Księstwa Litewskiego – pomniki prawa doby Odrodzenia / J. Bardach // Kwartalnik Historyczny. – 1974. – T. 81. – Z. 4. – S. 750–780.

16. Bardach, J. Unia polsko-litewska – jej treści i dziedzictwo/ J. Bardach // Symbolae historico-iuridicae lodzienses Iulio Bardach dedicate. – Łódź: Wydawnictwo Uniwersytetu Łódzkiego, 1997. – 192 s. – S. 17–26.

17. Bardach J. Z praktyki kancelarii litewskiej za Zygmunta Starego / J. Bardach // Bardach J. Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV – XVI wieku. – Warszawa: PWN, 1970. – S. 351–378.

18. Bardach J. Związek Polski z Litwą/ J. Bardach // Polska w epoce Odrodzenia. Państwo, społeczeństwo, kultura, pod red. A. Wyczańskiego. – Warszawa: Wiedza Powszechna, 1986. – 543 s. – S. 108–161.

19. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага [Тэкст]/ Ю. Бардах; пер. з пол. М. Раманоўскага, пер. з фр. А. Істоміна; уклад. Г. Сагановіч. – 2-е выд. – Мінск: «Медысонт», 2010. – 456 с.

20. Sucheni-Grabowska, A. Monarchia dwu ostatnich Jagiellonów a ruch egzekucyjny / A. Sucheni-Grabowska. – Wrocław-Warszawa-Kraków-Gdańsk: Wydawnictwo PAN, Zakład narodowy imienia Ossolińskich, 1974. –Cz. 1. Geneza egzekucji dóbr. – 302 s.

21. Sucheni-Grabowska, A. Obowiązki i prawa królów polskich w opiniach pisarzy Odrodzenia/ A. Sucheni-Grabowska// Między monarchą a demokracją. Studia z dziejów Polski XV–XVIII wieku, pod red. A. Sucheni-Grabowska i M. Żaryn. – Warszawa: Wydawnictwo Sejmowe, 1994. – 396 s. - S. 54–115.

22. Sucheni-Grabowska, A. Społeczność szlachecka a państwo/ A. Sucheni-Grabowska// Polska w epoce Odrodzenia. Państwo, społeczeństwo, kultura, pod red. A. Wyczańskiego. – Warszawa: Wiedza Powszechna, 1986. – 543 s. – S. 13–103.

23. Sucheni-Grabowska, A. Spory królów ze szlachtą w złotym wieku / A. Sucheni-Grabowska. – Kraków:Krajowa Agencja Wydawnicza, 1988. – 79 s.

24. Wyczański, A. Polska w Europie XVI stulecia/ A. Wyczański. – Warszawa : Wiedza powshechna, 1973. – 252 [4] s.

25. Wyczański, A. Zygmunt Stary / A. Wyczański. – Warszawa : Zamek królewski w Warszawie, 1985. – 69 s.

26. Wyczański, A. Dogonić Europę czyli Polska w czasach Zygmunta I (1506 – 1548) / A. Wyczański. – Kraków: Krajowa Agencja Wydawnicza, 1987. – 80 s.

27. Historiadypłomacji Polskiej (połowa X–XX w.): W 5 t. / Polski Institut Spraw Międzynarodowych. Pod red. G. Łabudy. – Warszawa: PWN, 1982. – T. 1: połowa X w. – 1572 / M. Biskup, K. Gorski, Z. Kaczmarczyk, G. Łabuda, Z. N. Nowak, K. Zelewski. Pod red. M. Biskupa. – 875 s.

28. Ochmański, J. HistoriaLitwy/ J. Ochmański. – Wyd. 1. – Wrocławetc. :Ossolineum, 1967. – 395 s.; Wyd. 2, rozsz. – Wrocławetc.:Ossolineum, 1981. – 395 s.; Wyd. 3. – Wrocławetc.:Ossolineum, 1982. – 395 s.; Wyd. 3, popr. iuzupel. – Wrocławetc.:Ossolineum, 1990. – 395 s.

29. Kosman, M. Władysław Jagiełło /M. Kosman. – Warszawa :Książka i Wiedza, 1968. – 290, [9]s.

30. Kosman,M. KrólowaBona / M. Kosman. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1971. – 368, [8]s.

31. Kosman, M. Od chrztu do chrystianizacji: Polska,Rus,Litwa / M. Kosman. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1992. – 171 s.

32. Kosman, M. O kresach w historii i legendzie: studia i szkice z dziejów polskiej granicy wschodniej / M. Kosman. – Poznań: Wydawnictwo Naukowe Wydziału Nauk Politycznych i Dziennikarstwa Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza, 2011. – Cz. I. – 191 s.

33. Kosman, M. Z polsko-litewskiej przeszłości: studia i szkice / M. Kosman. – Warszawa : Wydawnictwo «DiG», 2012. – 271 s.

34. Błaszczyk, G. Litwa na przełome średniowiecza i nowozytności: 1492–1569/ G. Błaszczyk. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 2002. – 336 s.

35. Błaszczyk, G. Dzieje stosunków polsko-litewskich od czasów najdawniejszych do spółczesności: w 2 t./ G. Błaszczyk. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 1998 – 2007. – T. I. Trudne początki. – 1998. – 366 s.

36. Błaszczyk, G. Dzieje stosunków polsko-litewskich: w 2 t./ G. Błaszczyk. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 1998 – 2007. – Tom II. Od Krewa do Lublina. – Cz. I. – 2007. – 936 s.

37. Pietkiewicz, K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami Aleksandra Jagiellonczyka. Studia nad dziejami państwa i spoleczeństwa na przełomie XV i XVI wieku/ K. Pietkiewicz. – Poznań: Wydawnictwo Naukowe UAM, 1995. – 256 s.

38. Nikodem, J. Zbigniew Oleśnicki wobec unii polsko-litewskiej do śmierci Jagiełły/ J. Nikodem // Nasza Przeszłość. – 1999. – T. 91. – S. 101–151; T. 92. – S. 85–135.

39. Nikodem, J.Stosunki Świdrygiełły z Zakonem Krzyżackim w latach 1430-1432/ J. Nikodem // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2000. – № 14. – S. 5–32.

40. Nikodem, J. Wyniesienie Świdrygiełły na Wielkie Ksistwo Litewskie/ J. Nikodem // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2003. – № 19. – S. 5–32.

41. Nikodem, J. Jedynowładztwo czy diarchia? Przyczynek do dziejów ustroju Wielkiego Księstwa Litewskiego do końca XV w./ J. Nikodem // Zapiski Historyczne. – 2003. –T. 68. –№ 4. – S. 7–30.

42. Nikodem, J. Polska i Litwa wobec husyckich Czech w latach 1420–1433. Studium o polityce dynastycznej Władysława Jagiełły i Witolda Kiejstutowicza/ J. Nikodem. – Poznań: Instytut Historii Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza, 2004. –442 s.

43. Nikodem, J. Jadwiga. Król Polski / J. Nikodem. – Wrocław: Ossolineum, 2009.–444 s.

44. Nikodem, J. Witold. Wielki książę litewski (1354 lub 1355–27 października 1430) / J. Nikodem. – Kraków: Wydawnictwo «Avalon», 2013. – 511 s.

45. Sobolewski, L., Uruszczak, W. Artykuły mielnickie z roku 1501 r./ L.Sobolewski, W. Uruszczak // Czasopismo Prawno-Historyczne. – 1990. – T. 42. – Z. 1–2. – S. 51–80.

46. Uruszczak, W. Sejm walny koronny w latach 1506–1540/ W. Uruszczak. – Warszawa: PWN, 1980. – 273 s.

47. Uruszczak, W. Sejm w latach 1506–1540/ W. Uruszczak // Historia sejmu polskiego. – Warszawa: PWN, 1984. – T. I. Do schyłku szlacheckiej Reczypospolitej, pod red. J. Michalskiego. – 447 s. – S. 63–113.

48. Uruszczak, W. Państwo pierwszych Jagiellonów/ W. Uruszczak. – Kraków Krajowa Agiencja Wydawnicza, 1999. – 75 s.

49. Korchak, L. Litewska rada wielkoksiążęca w XV wieku/ L. Korczak. – Kraków: Polska Akademia Umiejętności, 1998. – 120 s.

50. Korchak, L. Litwa – przechowana tożsamość/ L. Korczak. – Kraków: Międzynarodowe Centrum Kultury, 1998.–126 s.

51. Korchak, L. Monarcha i poddani. System władzy w Wielkim Księstwie Litewskim w okresie wczesnojagiellońskim/ L. Korczak. –Kraków: Towarzystwo wydawnicze «Historia Iagellonica», 2008. –207 s.

52. Szulc, D. Miejsce unii Horodelskiej w polsko-litewskich nogocjacjach unijnych w latach 1492–1506 / D. Szulc// Prace Historyczne. Zeszyty naukowe uniwersytetu Jagiellonskiego. – 2014. –№ 141. – Z. 2. – S. 339–365.

53. Szulc, D. Wymiana dyplomatyczna miedzy Polską i Litwą w sprawach moskiewskich w latach 1492–1569 / D. Szulc// 1514 m. Oršos mūšis: karinė pergalė ir jos ženklai. Skiriama Oršos mūšio 500 metų sukakčiai paminėti. Pranešimų tezės. – Vilnius: LII leidykla, 2014. – S. 23–26.

54. Rachuba, A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569–1763/ A. Rachuba. – Warszawa: Wydawnictwo sejmowe, 2002. – 375 s.

55. Рахуба, А. Вялікае Княства Літоўскае ў парламенцкай сістэме Рэчы Паспалітай 1569–1763 гг. / А. Рахуба; пер. з пол.мовы М. Раманоўскага; навук. рэд. Г. Сагановіч.– Мінск: «Медысонт», 2008. – 424с.

56. HistoriaLitwy: dwugłospolsko-litewski / A.Rachuba, J.Kiaupienė, Z. Kiaupa. –Wyd. 2. – Warszawa: Wydawnictwo «DiG», 2009.– 388 s.

57. Zakrzewski, A. B. Recepcja ustroju i prawa w Wielkim Księstwie Litewskim, XIV–XVIII wiek/ A.B. Zakrzewski// Studia Iuridica. – Warszawa: Wydawnictwo Uniwersytetu Warszawskiego, 2002. – T. 40. – S. 247 – 261.

58. Zakrzewski, A. B. Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI–XVIII w. Ustrój i funkcjonowanie – sejmik trocki/ A. B. Zakrzewski. – Warszawa: Liber, 2000. – 257 s.

59. Zakrzewski, A. B. Wielkie Księstwo Litewskie (XVI–XVIII w.). Prawo-ustrój-społeczeństwo / A.B. Zakrzewski. – Warszawa: Campidoglio, 2013. – 322 s.

60. Lulewicz, H. Gniewów o unię ciąg dalszy. Stosunki polsko-litewskie w latach 1569–1588/ H. Lulewicz. –Warszawa: Neriton, Instytut historii PAN, 2002. – 457 s.

61. Wisner, H. Litwa. Dzieje państwa i narodu / H. Wisner. – Warszawa: Mada, 1999. – 300 s.